красноречиво свидетельствует, что рост этноконфессиональных противоречий произошел на фоне политической, экономической, правовой дестабилизации СФРЮ, а также неопределенности системы социалистических международных отношений.

## БИБЛИОГРАФИЧЕСКИЕ ССЫЛКИ

1. Кудров, В. М. Югославия: прощальный экономический и статистический портрет [Электронный ресурс] / В. М. Кудров // Федеральный образовательный портал ЭСМ. – 2008. – Режим доступа: http://ecsocman.hse.ru/data/045/217/1218/9.pdf. – Дата доступа: 18.01.2018.

2. Романенко, С. Югославский Рубикон [Электронный ресурс] / С. Романенко // Журнальный зал. – 1996. – Режим доступа: http://magazines.russ.ru/nlo/2007/83/ro11-pr.html. – Дата доступа: 18.01.2018.

3. Тошович, Б. Общая информация / Б. Тошович // Корреляционная грамматика сербского, хорватского и бошняцкого языков / Б. Тошович. – М., 2011. – Гл.1.– С. 17–21.

4. Гуськова, Е. Ю. Вооруженный конфликт и политическое урегулирование: Кризис диалоговой модели на Балканах в 90-е годы XX века / Е. Ю. Гуськова // Новая и новейшая история. – 2016. – № 6. – С. 78.

5. Романенко, С. А. Югославия: прощальный экономический и статистический портрет [Электронный ресурс] / С.А. Романенко // Федеральный образовательный портал ЭСМ. – 2018. – Режим доступа: http://ecsocman.hse.ru/data/889/219/1217/006rOMA-NENKO.pdf. – Дата доступа: 18.01.2018.

6. Иванова, Ю. В. Косовский кризис. Этнические аспекты проблемы / Ю. В. Иванова // Исследования по прикладной и неотложной этнологии. – 1999. – № 128. – С. 3–16.

7. Табачников, Б. Я. Югославский разлом [Электронный ресурс] / Б. Я. Табачников // Научный журнал Вестник. – 2002. – Режим доступа: http://www.vestnik.vsu.ru/pdf/history/2009/02/2009-02-04.pdf. – Дата доступа: 18.01.2018.

# ПАРУШЭННЕ ЎМОЎ ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ ВЯЛІКІМ КНЯСТВАМ ЛІТОЎСКІМ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ)

**Дземідовіч А. В.,**
дацэнт кафедры міжнародных адносін БДУ, канд. гіст. навук

Сярод шэрагу ўмоў, на якіх была заключана Люблінская унія, адной з найважнейшых з'яўлялася тая, якая рэгламентавала сферу знешнепалітычных адносін. Згодна з Люблінскім актам усе саюзы, пагадненні, мірныя дамовы з іншымі народамі, а таксама выпраўленне пасольстваў у іншыя дзяржавы па важных справах, павінны былі ў наступным ажыццяўляцца не інакш як з ведама і па дазволу прадстаўнікоў абодвух народаў [1, с. 90].

Гэта значыць, што прадугледжвалася сумесная ўзгодненая знешнепалітычная дзейнасць абедзвюх частак федэрацыі.

Аднак рэаліі ўзаемастасункаў Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) і Каралеўства Польскага (КП) паказалі, наколькі гістарычная рэчаіснасць адрознівалася ад згаданых вышэй унійных імператываў. Бясспрэчна, геапалітычнае становішча, уласныя інтарэсы ВКЛ і КП абумоўлівалі рознае стаўленне гэтых дзяржаўных адзінак да актуальных праблем знешняй палітыкі. Акрамя таго, шмат у чым аўтаномны статус ВКЛ у складзе федэратыўнай дзяржавы забяспечваў яму магчымасці кіравацца ўласным бачаннем знешнепалітычных спраў, што не заўсёды адпавядала інтарэсам манарха і КП. Пасля Люблінскай уніі засталася пэўная адасобленасць ВКЛ ад КП (як вынік умоў самога дагавора, так і барацьбы Княства за ўласныя правы ў першыя паслялюблінскія дзесяцігоддзі), што выяўлялася ў захаванні за Княствам назвы дзяржавы, уласнай тэрыторыі з афіцыйна прызнанымі межамі і сталіцай; цэнтральных і мясцовых органаў улады; незалежнай судовай сістэмы і заканадаўства; асобнага войска, скарбу, сімволікі, пячаткі, мовы. Прыняцце Статута 1588 г., які ігнараваў Люблінскую унію, увогуле паставіла пад сумненне з боку ВКЛ вартасць заключэння дзяржаўнага саюзу 1569 г., шэраг умоў якога, фактычна, не быў рэалізаваны. Зацвярджэнне Статута 1588 г., практыка склікання асобных соймаў, стварэнне Трыбунала – асноўныя моманты, якія забяспечвалі ВКЛ статус паўнапраўнай часткі дзяржавы, "паловы" Рэчы Паспалітай. А захаванне ВКЛ пасля Люблінскай уніі асобнага адміністрацыйнага апарату, сярод якога бадай што найважнейшае месца займала пасада канцлера, ужо само па сабе прадугледжвала актыўную пазіцыю Княства ў вырашэнні пытанняў міжнароднага характару.

Такім чынам, унія не гарантавала ўзгодненасці дзеянняў ВКЛ і КП, што праяўлялася як у пытаннях унутрыдзяржаўнага жыцця, так і ў знешнепалітычных. Стаўленне шляхты (палітычнаактыўнай часткі грамадства) ВКЛ да уніі характарызавалася неадназначнасцю: у некаторых выпадках яна настойліва патрабавала ад свайго партнёра па саюзе выканання ўмоў Любінскага акту, у іншых – ішла наперакор.

Ігнараванне адпаведных пунктаў Люблінскай уніі Княствам выразна праявілася ўжо ў перыяды першых бескаралеўяў Рэчы Паспалітай: 1572–1573 гг.; 1574–1575 гг.; 1586–1587 гг. Часовае нефункцыянаванне цэнтральнай улады стварала для шляхты ВКЛ умовы, у якіх яна спрабавала часткова ажыццявіць "рэвізію" палажэнняў Люблінскай уніі, і, па магчымасці, змяніць уласнае становішча ў межах Рэчы Паспалітай. Напрыклад, вярнуць у свой склад украінскія землі, якія адыйшлі ў 1569 г. да КП; пашырыць уласнае прадстаўніцтва ў сенаце; склікаць соймы па чарзе на тэрыторыі КП і ВКЛ. У часы бескаралеўяў ВКЛ самастойна вяло перамовы з некаторымі

прэтэндэнтамі на прастол Рэчы Паспалітай, дэманстравала намеры да асобнай ад палякаў элекцыі і накіроўвала місіі да новавыбраных манархаў. Па сутнасці, матывы гэтых падобных дзеянняў можна звесці да жадання наглядна прадэманстраваць сваю вагу ў межах Рэчы Паспалітай.

Асноўным паказчыкам парушэння ўмоў Люблінскай уніі з’яўляюцца дагаворы, заключаныя Княствам без узгаднення з КП: з Расійскай дзяржавай і Швецыяй. Першай знешнепалітычнай акцыяй такога характару было самастойнае падпісанне прадстаўнікамі ВКЛ у жніўні 1587 г. перамір’я “паміж Каронай Польскай і Вялікім Княствам Літоўскім і паміж вялікім гаспадаром і вялікім князем Федарам Іванавічам…на пятнаццаць гадоў…” [2, с. 83–88]. Дадзенае перамір’е заключалася, як бачна з тэкста, ад імя Кароны і ВКЛ, гэта значыць – усёй Рэчы Паспалітай.

Некалькі не ўзгодненых з КП кароткачасовых перамір’яў заключыла ВКЛ у XVII ст. падчас войнаў Рэчы Паспалітай са Швецыяй: у сакавіку 1626 г., кастрычніку 1626 г., студзені 1627 г. (ад імя толькі ВКЛ). Было гэта здзейснена па ініцыятыве вялікага гетмана ВКЛ Льва Сапегі, без ведама манарха і шляхты КП. Калі дамова аб спыненні ваенных дзеянняў 1626 г. выклікала папярэджванне ад манарха, каб падобнае больш не паўтаралася [3, с.49], наступствам перамір’я са шведамі 1627 г. з’явіўся моцны грамадскі рэзананс у Рэчы Паспалітай: абурылася такім учынкам шляхта Кароны, угледзіўшы ў гэтым парушэнне Люблінскай уніі, а таксама асцерагаючыся паўтарэння такіх прэцэдэнтаў у будучыні; выказаў незадаволенасць такім дзеяннем і Жыгімонт III Ваза. Разгарнулася спецыфічная палеміка паміж прадстаўнікамі ВКЛ і КП. Аднак у 1629 г. сітуацыя паўтарылася: ВКЛ падпісала чарговае перамір’е са Швецыяй на кароткі тэрмін.

Крокам ВКЛ, які не толькі супярэчыў Люблінскай уніі, але ўвогуле яе скасоўваў, з’явілася падпісанне Кейданскай уніі ў кастрычніку 1655 г. – дагавора паміж ВКЛ і Шведскім Каралеўствам. Ва ўмовах небяспекі з боку Расіі і Швецыі ВКЛ трапляла пад шведскі пратэктарат, адмаўляючы Яну II Казіміру ў правах на Княства. Ініцыятарамі уніі выступілі прадстаўнікі вядомага магнатскага роду – вялікі гетман ВКЛ Януш Радзівіл і канюшы ВКЛ Багуслаў Радзівіл.

Падчас пачатковага этапу Вялікай Паўночнай вайны (1700–1721 гг.), якая ўплывала на грамадзянскую вайну ў ВКЛ, апошняе заключыла тры самастойных пагадненні з Расійскай дзяржавай. Арыентацыя Сапегаў на шведаў і дапамога ім з боку Карла XII у 1701 г. (па сутнасці ўмяшальніцтва ў барацьбу паміж магнатамі ВКЛ) справакавала спробы іх апанентаў шукаць ваеннай і фінансавай падтрымкі ў Расіі. У сваю чаргу Расія ў абмен на дапамогу прапанавала ВКЛ заключыць з ёю саюз і ўступіць у вайну супраць Швецыі. На працягу 1702–1703 гг. ВКЛ было падпісана некалькі дамоваў з Расіяй (вясной 1702 г.; летам 1703 г.; зімой 1703 г.). Сэнс іх можна звесці да

наступнага. ВКЛ і Расія знаходзіліся ў спецыфічным саюзе: пры падтрымцы Расіі Княства павінна было ваяваць супраць шведаў [5, с.°11]. Ні ўмовы дагавораў, ні абставіны іх заключэння не прывялі да разрыву уніі паміж ВКЛ і КП, але факт іх падпісання супярэчыў тэксту Люблінскага пагаднення.

Такім чынам, умовамі Люблінскай уніі 1569 г. выключалася асобная знешнепалітычная дзейнасць частак новаўтворанай дзяржавы. Аднак на практыцы ВКЛ часам парушала адпаведную пастанову ўнійнага акта, што было абумоўлена шэрагам фактараў: жаданнем Княства зацвердзіць уласны статус у межах федэрацыі; крытычным становішчам падчас войнаў; амбіцыямі асобных палітычных лідэраў; умовамі самой уніі, што захавалі падвоенасць адміністрацыйнага апаратара, а значыць стваралі перадумовы для неўзгодненасці суб’ектаў РП як ва ўнутранай, так і знешняй палітыцы.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Volumina legum : przedruk zbioru praw staraniem XX. Pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782, wydanego : w 9 t. / wyd. S. Konarski. – Petersburg : J. Ohryzki, 1859–1860. – T. 2 : Ab anno 1550 ad annum 1609. – 1859. – 482, XIII s.

2. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика / Lietuvos istorijos instituto leidykla. – Vilnius : Mokslo ir Enciklopediju Leidykla, 2006. – Kn. 594 : 1585–1600 / parengė A. Baliulis. – 300 p.

3. Wisner, H. Dyplomacja polska w latach 1572–1648 / H. Wisner // Historia dyplomacji polskiej (połowa X–XX w) : w 6 t. / pod red. G. Labudy [et al.]. – Warszawa, 1982–1999. – T. 2 : 1572–1795. – 1982. – S. 5–161.

4. Ateneum wileńskie. Czasopismo naukowe, poświęcone badaniom przeszłości ziem Wielkiego X. Litewskiego. – Wilno : wyd. Wydziału III Towarzystwa Przyjaciół Nauk w Wilnie, 1935. – Rocznik X / Red. B. Wilanowski. – 580 s.

5. Feldman, J. Polska w dobie wielkiej wojny poolnocnej / J. Feldman. – Kraków: Nakładem Polskiej Akademii Umiejętności, 1925. – 318 s.

# СОТРУДНИЧЕСТВО МЕКСИКИ И США В СФЕРЕ БЕЗОПАСНОСТИ

**Ендовицкий И. Ю.,**
студент 4 курса кафедры международных отношений БГУ,
**Достанко Е. А.,**
начальник ЦМИ ФМО БГУ, доцент кафедры международных отношений,
канд. полит. наук

В декабре 2006 г. Фелипе Кальдерон был избран президентом Мексики на фоне расширения масштабов наркоторговли и связанного с ней насилия. В связи с этим борьба с организованной преступностью стала приоритетом его внутренней политики. Уже вскоре после своего избрания, в марте